# І сніцца будуць людзям тыя вёскі

За час сваёй журналісцкай работы некалькі разоў давялося быць па камандзіровачных справах у вёсцы Дзям’янкі Добрушскага раёна. І заўсёды адкрываў для сябе новыя радкі яе, скажам так, біяграфіі. Знаходзіцца гэты населены пункт у вельмі маляўнічым месцы, дзе працякае павольная і неглыбокая Іпуць: улетку ў берагах з разнатраўем ды лугавымі кветкамі, а вясной — у шырокім разводдзі з затопленай поймай. Аб пагорках ды зялёных прысадах вёскі, якую акружаюць палі ды лясы, і казаць ужо не варта. Бо і яны надаюць Дзям’янкам своеасаблівы каларыт.

Здаўна людзі аблюбавалі гэтыя зручныя для жыцця і прыгожыя мясціны, аб чым сведчаць стаянкі эпохі неаліту, адкрытыя археолагамі курганы, магільнікі. А ў другой палове XVI стагоддзя Дзям’янкі згадваюцца ў дакументах як сяло Гомельскага староства. Вёска належала тады магнату Тышкевічу, а ў XIX стагоддзі яе ўладальнікам сталі латышскія дваране Герарды. Адзін з іх, Мікалай Мікалаевіч, меў чын генерал-губернатара і быў намеснікам цара ў Фінляндыі. Калі ён пайшоў у адстаўку і пераехаў у свой маёнтак у Дзям’янкі, то загадаў па праекце пецярбургскіх архітэктараў пабудаваць велічны палац і разбіць парк, што і было зроблена. У маёнтку былі спіртзавод, фермы для жывёлы, аранжарэі, цяпліцы і г.д. Пасля рэвалюцыі ў палацы адкрылі дзіцячы дом, а ў час Вялікай Айчыннай вайны тут размяшчаўся карны атрад, і калі немцы вымушаны былі адступаць, яны спалілі гэту прыгажосць. Пазней, у 1977 годзе, так і не адноўлены будынак зноў пацярпеў ад пажару.

Дзям’янкі з’яўляліся адным з самых вялікіх населеных пунктаў Добрушскага раёна. Яшчэ ў 1929 годзе тут быў створаны калгас, адкуль у 40-х некалькі соцень мужчын адправіліся на вайну з немцамі і 200 з іх загінулі, а ў 1970 годзе тут было 325 двароў і жыло 1249 чалавек. Адны працавалі ў калгасе, іншыя — на цагельным заводзе, у сярэдняй школе, крамах, камбінаце бытавога абслугоўвання, Доме культуры і г.д. І ўсё гэта — у Дзям’янках.

Так бы і праходзіла жыццё вяскоўцаў далей, калі б не выбух на Чарнобыльскай АЭС. Аднаго толькі радыеактыўнага цэзію-137 асела тут у колькасці 15—40 кюры на квадратны кіламетр, што сведчыла: для пражывання народа — небяспека вялікая. Пераязджаць кудысьці трэба. Перасяліліся людзі з надзеяй, што праз пэўны час вернуцца на сваю малую радзіму. Тым больш што ведалі: у вёсцы засталося жыць некалькі чалавек у чатырох дамах, значыць, не ўсё яшчэ страчана. Толькі памыляюцца яны. Бо яе рыхтуюць да пахавання, калі хаты і ўсе іншыя збудаванні лягуць навечна ў зямлю і зямлёй іх накрыюць. Гэты лёс ужо напаткаў суседнія і аддаленыя вёскі раёна: Вылева, Ачэса-Рудню, Марозаўку, Чырвоны Сцяг, Закапыцце.

— Калі б спіс на гэтым закончыўся, — кажуць дырэктар і галоўны інжынер рэспубліканскага спецыялізаванага ўнітарнага прадпрыемства "Палессе" Ягор Паверbegin Паверany і Генадзь Якімчанка. — Ён доўгі-доўгі: Дубецкае, Пеннае, Дубовы Лог, Плоскае... У сямнаццаці населеных пунктах Добрушчыны мы пахавалі ўжо 1052 збудаванні.

— За які час?

— З 1993 года на канец мінулага.

Тут трэба, вядома ж, сказаць, што "мірны" атам праявіў сваю агрэсію больш за ўсё на тэрыторыі Гомельшчыны, і працаўнікам РСУП "Палессе" работы хапае пад самую завязку. За названы час, напрыклад, яны былі задзейнічаны на разборцы будынкаў і збудаванняў Нараўлянскага, Брагінскага, Хойніцкага, Чачэрскага, Веткаўскага, Кармянскага, Ельскага, Добрушскага, і Буда-Кашалёўскага і Лельчыцкага раёнаў. Акрамя таго, у Мазыры і Гомелі былі ліквідаваны адпаведна адзін і 19 будынкаў: або завезеных з раёнаў, дзе іх зносілі, або радыенукліды аселі ў матэрыялах для будаўніцтва, набытых у тых жа "чарнобыльскіх" раёнах.

У зямлю навечна ляглі 5622 будынкі і збудаванні 112 населеных пунктаў, у тым ліку 3001 у адселеных вёсках і 2621 у тых, дзе яшчэ, як кажуць, цепліцца жыццё. Апошняе азначае, што там жыве ад адной да трох-пяці сем’яў у асноўным, вядома ж, старых людзей, якія нікуды перабірацца не пажадалі, нягледзячы на

папярэджанні, што яны пацерпяць ад моцнага ўздзеяння нябачнай радыяцыі.

— А ці дорага абыходзяцца спецработы па разборцы і пахаванні будынкаў у чарнобыльскай зоне?

— Мяркуйце самі. Сёлета ў першым квартале ў вёсцы Будзішча Чачэрскага раёна мы ліквідавалі 37 падворкаў з драўлянымі пабудовамі, і ў сярэднім кожны з іх абышоўся ў 4 мільёны рублёў. У Губарэвічах Хойніцкага раёна знеслі 23 падворкі з цаглянымі, драўлянымі пабудовамі. Кошт кожнага — 6,4 мільёна. А ў Навілаўцы Веткаўскага раёна мы пахавалі ў зямлю дзве былыя механічныя майстэрні, і кожнае з гэтых капітальных збудаванняў пацягнула на 54,4 мільёна рублёў. Заўважым, што разлік кошту робіцца па рэсурсна-каштарысных нормах, якія зацверджаны Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. Мы ж прымяняем паніжаючы каэфіцыент К=0,4 да нормаў накладных расходаў, планавых накапленняў, і ў выніку работы нашага прадпрыемства абыходзяцца танней, чым калі б яны выконваліся будаўнікамі.

Работнікі "Палесся" на сваіх аб’ектах у радыяцыйнай зоне працуюць вахтавым метадам, начуючы ў гасцініцах у райцэнтрах. Ежу ў пераважнай большасці яны гатуюць самі. У іхнім распараджэнні магутная тэхніка, на якую выпадае вялікая нагрузка, бо зімой, калі глыбока прамярзае грунт, угрызацца ў яго даволі няпроста.

Летась, як і раней, быў выкананы вялікі аб’ём работ. Адбыліся нарэшце зрухі ў зносе і пахаванні жылых дамоў і сельгаспабудоў вёскі Струмень Кармянскага раёна, да якой падбіраліся некалькі разоў з-за недахопу фінансавых сродкаў. У зямлю пайшлі тады 178 падворкаў, а засталося яшчэ 74. Гэта ўжо — сёлетні клопат. Тады ж былі пахаваны 173 падворкі ў вёсках Кіраў, Вербавічы, Канатоп, Галоўчыцы Нараўлянскага раёна, 57 — у Мікулічах Брагіншчыны, а ўсяго — 536.

На гэты год калектыву "Палесся" пастаўлена задача асвоіць каля 16 мільярдаў рублёў на дэзактывацыйных работах. Для параўнання: летась было на гэтыя мэты выдзелена сем мільярдаў. Як бачна, праграма значна большая і, каб выканаць яе, да работ будуць падключаны да "Палесся" субпадрадныя арганізацыі, вядома ж, на тэндарнай аснове. І тут маецца адна такая важная акалічнасць: субпадрадчыкі будуць працаваць толькі ў так званых рэабілітаваных населеных пунктах, дзе пражываюць людзі. І абавязкова — пад кантролем РСУП, у тым ліку і пад дазіметрычным суправаджэннем з боку яго работнікаў.

У першым квартале пахавана ўжо не адна сотня пабудоў у Чачэрскім, Кармянскім і Веткаўскім раёнах, дзе работы працягваюцца і сёння. Ідуць яны і ў вёсках Губарэвічы, Чырвонае возера і Плоскае Хойніцкага раёна, дзе імі кіруе начальнік участка Юрый Гурачэўскі і майстры Дзмітрый Шыцікаў і Сяргей Арэшчанка. Толькі ў Губарэвічах давядзецца пахаваць 135 падворкаў.

Сёлета ў "Палессі" з’явілася новае падраздзяленне, якое займаецца распрацоўкай праектна-каштарыснай дакументацыі на знос і пахаванне пабудоў у "чарнобыльскіх" раёнах. Раней гэта рабілі ў адным з праектных інстытутаў. І такая навінка толькі на карысць справе, як і тое, што ўжо трэці год грашовымі сродкамі "Палессе" забяспечвае фінансавае ўпраўленне Гомельскага аблвыканкама замест Дзяржкамчарнобыля.

Займаюцца і дэзактывацыяй прамысловага абсталявання ад радыенуклідаў. Напрыклад, на адным толькі "Гомсельмашы" з 1991 па 2006 год яе правялі на 523 адзінках абсталявання (вентыляцыя, кампрэсарныя станцыі і г.д.). А гэта ж амаль 120 тысяч квадратных метраў паверхняў таго абсталявання, па якіх трэба было дэталёва прайсціся хімічнымі растворамі, шчоткамі, скрабкамі ды электраінструментам. У меншых памерах падобныя работы былі выкананы таксама на Жлобінскай фабрыцы штучнага футра, плывучым кране ў Мазыры, бавоўна-прадзільнай і ткацкай фабрыках у Ветцы, на іншых 28 прадпрыемствах.

Праводзілася дэзактывацыя і так званых адкрытых тэрыторый — дзіцячых садкоў, школ, спартыўных і іншых пляцовак, а таксама ўстаноў аховы здароўя, дзе аселі ў свой час радыенукліды.

Ці падсцерагае небяспека работнікаў "Палесся" ў час работы на аб’ектах, спытаў я ў Паверанага і Якімчанкі. "А як жа", — адказалі яны. Таму на аб’ектах праводзіцца пастаянны дазіметрычны кантроль, захоўваюцца меры перасцярогі. Людзям выдаюцца спецадзенне і абутак для розных відаў дэзактывацыйных работ, прымяняюцца сродкі для аховы органаў

дыхання. У тых, хто мае права працаваць ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання, ёсць санітарны пашпарт, яны праходзяць медыцынскі агляд.

Наперадзе ў РСУП "Палессе" работы хопіць не на адзін год. Бо калектыву неабходна будзе пахаваць не менш за сем тысяч будынкаў і збудаванняў, якія насычаны радыенуклідамі. І кіраўнікі яго лічаць, што пры выкананні тых работ на заканадаўчым узроўні нялішне вырашыць наступныя пытанні. Так, да сёння з неперспектыўных населеных пунктаў, дзе жыццё забаронена і адкуль людзі перасЕлены, але там засталіся жыць некалькі пажылых і старых чалавек, матэрыялы ад разборкі радыяцыйна забруджаных падворкаў на пахаванне адвозяцца на звалкі цвёрдых і бытавых адходаў іншым разам на адлегласць да 60 і больш кіламетраў. А чаму б не рабіць гэта непасрэдна на месцы? Тым самым затраты дзяржаўных грошай знізіліся б прыблізна на 12 працэнтаў.

І яшчэ. Раней прадпрыемству выдзяляліся кар’еры для адбору там грунту, які выкарыстоўваўся для вертыкальнай планіроўкі месцаў пахавання падворкаў, і пляцоўкі цвёрдых бытавых адходаў на бязвыплатнай аснове. Цяпер райвыканкамы гэтыя пытанні не вырашаюць, і "Палессю" рэкамендавана ўносіць плацяжы па экалагічным падатку і за размяшчэнне тых адходаў, і за выкарыстанне пяску і грунту, з якіх яно ніякіх тавараў і прадукцыі не вырабляе. Гэта таксама прывядзе да падаражэння спецработ. Пытанне: а навошта?

***Уладзімір ПЕРНІКАЎ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-25 крас.-С.5.